**УДК: 821.161.3**

**Леська Лілія Пятроўна**
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры беларускай
і замежнай літаратуры
Беларускі дзяржаўны педагагічны
ўніверсітэт імя Максіма Танка
г. Мінск, Беларусь

**Liliya Leska**
PhD of Philology, Associate Professor of the
Department of Belarusian and Foreign Literature
Belarusian State Pedagogical University named
after Maxim Tank
Minsk, Belarus
leska.l.5@yandex.ru

# АСПЕКТЫ ВІЗУАЛЬНАГА Ў АПОВЕСЦІ "НІЗІНЫ" Э. АЖЭШКІ

# ASPECTS OF THE VISUAL IN THE STORY *THE LOWLANDS* BY E. OZHESHKO

У артыкуле ўпершыню ў айчынным літаратуразнаўстве разглядаецца візуальны аспект твораў Э. Ажэшкі як адзін са значымых элементаў мастацкага свету пісьменніцы. Акцэнтуецца ўвага на першых падыходах да праблемы візуальнасці ў мастацкіх тэкстах пісьменніцы, зробленых сучаснымі беларускімі літаратуразнаўцамі (А. Білютэнка, В. Гапава, Е. Лявонава, С. Мусіенка).

Праведзены агляд крытычнай літаратуры па тэме даследавання, падкрэслена актуальнасць працы, сфармулявана ключавое азначэнне візуальнасці.

Сродкамі даследавання візуальнага ў аповесці "Нізіны" Э. Ажэшкі з'яўляюцца гульня святла і ценю, зрокавыя асацыяцыі, аспекты бачання чытача і аўтара, прыёмы самараскрыцця і характарыстыкі аднаго персанажа іншымі, пункт погляду, апісальнасць прадметнага свету, касцюмаў герояў (вылучана функцыянальная мнагазначнасць шматдэталёвасці ў касцюмах персанажаў альбо недахоп некаторых фрагментаў іх вопраткі), інтэр'ера. Падкрэслена роля элементаў візуальнасці пры раскрыцці праблемы Іншага ў творах пісьменніцы.

Ключавыя словы: *Э. Ажэшка*; *візуальнае*; *Іншы*; *прыём самараскрыцця*; *пункт погляду*; *аповесць*.

The article examines the visual aspect of E. Ozheshko's works as one of the significant elements of the writer's artistic world. Attention is focused on the first approaches to the problem of visuality in the literary texts of the writer, made by modern Belarusian literary critics (A. Bilyutenko, V. Gapova, E. Leonova, S. Musienko). A review of the critical literature on the research topic has been conducted, the relevance of the work has been determined, and a key definition of visuality has been formulated. The means of visual research in the story *The lowlands* by E. Ozheshko are the play of light and shadow, visual associations, aspects of the vision of the reader and the author, techniques of self-disclosure and characteristics of one character by others, point of view, descriptiveness of the objective world, costumes of the characters (the functional ambiguity of the multiple details in the costumes of E. Ozheshko's characters, or the lack of some fragments of the characters' clothes), interior. The role of visual elements in revealing the problem of the other in the translator is emphasized.

Key words: *E. Ozheshko*; *visual*; *other*; *self-disclosure technique*; *point of view*; *story*.

Праблема візуальнага на матэрыяле мастацкіх твораў Э. Ажэшкі вывучаецца ўпершыню, хаця беларускія літаратуразнаўцы (А. Білютэнка, В. Гапава, Е. Лявонава, С. Мусіенка, У. Навумовіч) прама і ўскосна разглядалі некаторыя аспекты гэтай з'явы ў мастацкіх тэкстах пісьменніцы. Так, у прадмовах да зборнікаў "Творчасць Элізы Ажэшкі і беларуская культура" (2002) [1], "Творчасць Элізы Ажэшкі ў эстэтычнай прасторы сучаснасці" (2011) [2] рэдактары і ўкладальнікі падкрэсліваюць, што вынікам мастацкай дзейнасці пісьменніцы стала дзівосная *панарама* жыцця жыхароў наднёманскай зямлі: палякаў, беларусаў, габрэяў" (курсіў мой. – *Л. Л.)* [2, с. 5]. Е. Лявонава ў артыкуле "Чуйнае сэрца. Штрыхі да творчага партрэта Элізы Ажэшкі" адзначае, што ў творах пісьменніцы "пададзена карціна жыцця парэформеннай вёскі" [3, с. 44].

Побач з панарамным шматаспектным аглядам рэчаіснасці ў мастацкім свеце пісьменніцы вылучаюцца моманты пільнага ўглядання, аўтарскай канцэнтрацыі на адным з бакоў грамадскага жыцця. Вынікам своеасаблівага факусіраванага погляду мастака слова, на думку айчыннага даследчыка А. Білютэнка, стала "бачанне свету ў яго шматграннасці і ў драматычна недасканалай рэальнасці" [4, с. 84]. У аповесці "Дзюрдзі" пісьменніца засяроджвае ўвагу чытачоў на тым факце, што "страшнае зладзейства здзейснена сялянамі, працаўнікамі" [4, с. 84]. Магчыма, так у мастацкіх творах Э. Ажэшкі адчуваецца "імкненне <…> цвяроза глянуць на народ, паказаць яго без ідэалізацыі і натуралістычных адхіленняў ад нормы" [5, с. 130].

Такім чынам, беларускія літаратуразнаўцы звярнулі ўвагу на ролю візуальнага ў творах пісьменніцы пры панарамнай абмалёўцы рэчаіснасці і псіхалагічнай характастыцы герояў. Нягледзячы на слушныя заўвагі і назіранні вучоных, ключавая праблема дадзенага артыкула застаецца да канца не раскрытай.

Актуальнасць тэмы абумоўлена тым фактам, "што літаратурацэнтрычная эпоха адыходзіць у мінулае. Мастацкая літаратура па пэўных аб'ектыўных прычынах ужо не можа сёння прэтэндаваць на тую выключную духоўнакансалідуючую ролю, якую яна выконвала ў грамадстве яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму назад" [6, с. 55]. Айчынны даследчык Я. Гарадніцкі пераканаы, што візуалізацыя культурнай прасторы набывае ў наш час самае шырокае распаўсюджанне, "пранікаючы ва ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека, абумоўліваючы сабой працэсы ўспрымання і асэнсавання шматстайных з'яў рэчаіснасці" [6, с. 55]. Так, у кіназнаўстве аб'ектамі вывучэння становяцца відэатычныя сістэмы і вобразы, у тэатразнаўстве абавязковымі для разгляду выступаюць зрокавыя падтэксты сцэнічнага дзеяння. Сацыялогія, псіхалогія, культуралогія ў адносінах да сучасных рэцэптыўных асаблівасцей чалавека фіксуюць дамінаванне зрокавага ўспрымання сярод іншых, апелююць да візуальнага мыслення.

У сучасным літаратуразнаўстве аспекты візуальнага актыўна даследуюцца[1] як на шырокім матэрыяле культуры, які ўключае змены творчых метадаў і кірункаў у мастацкай літаратуры, так і на матэрыяле мастацкіх твораў асобных аўтараў.

У карціне свету таго або іншага кірунку фарміраваліся асаблівыя мадэлі/тыпы (псіхалагічныя, кампазіцыйныя) славеснай нагляднасці, прасочвалася "традыцыя перадрамантычнай, рамантычнай і пострамантычнай «трансгрэсіі погляду»" (Ц. Тодараў), якая суіснуе і супрацьстаіць рэалістычнай панарамна-гістарычнай мадэлі візуальнага. На перакрыжаванні традыцый "трансгрэсіі погляду" і рэалістычнай панарамна-гістарычнай мадэлі візуальнага семіятычна афармляецца мадэрнісцкая, постмадэрнісцкая мастацкая культура "зроку гранічна блізкага" (М. Ямпольскі), адной з разнавіднасцей якога з'яўляецца "фасетачны зрок" (У. Набокаў) [7].

У сучасным літаратуразнаўстве зроблены тэарэтычныя ўдакладненні паняццяў "візуалізацыя" і "візуальнае" ў мастацкіх тэкстах. Візуалізацыя, згодна з трактоўкай даследчыцы В. Васіяравай, з'яўляецца працэсам, які адлюстроўвае бачную карціну свету, уключаючы ў сябе візуальнае як адну з праяў візуалізацыі – "мастацкага інструмента, сістэмы прыёмаў і метадаў, з дапамогай якіх адбываецца стварэнне сітуацыі апісання вобраза, партрэта, пейзажу" [8, с. 7].

Вызначэнне паняцця візуальнага прадстаўлена ў дысертацыі Д. Мухачова "Візуальная паэтыка Пецярбурга ў творчасці У. Набокава (рускі перыяд)" [9]. Візуалізацыя ў літаратуры, на думку вучонага, – гэта "выкарыстанне сістэмы прыёмаў візуальных відаў мастацтва (жывапіс, скульптура, кіно, фотаздымкі). Сюды адносяцца прыёмы кампазіцыі (спалучэнне планаў, дэталяў прадметнага свету, факусіроўка, перспектыва), а таксама асаблівасці мастацкай мовы, якія абазначаны тэрмінам «славесная

[1] Кауфман, С. Н. Визуальность в поэтике Н. В. Гоголя: повествовательный аспект : автореф. дис. ... канд. филол.наук : 10.01.01 / С. Н. Кауфман ; Новосиб. гос. пед. ун-т. – Новосибирск, 2013. – 15 с.; Сузюрукова, Е. Л. Визуальные образы в творчестве А. П. Чехова : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.01.01 / Е. Л. Сузюрукова ; Новосиб. гос. пед. ун-т. – Новосибирск, 2022. – 18 с.; Дёгтева, Я. Н. Чужой взгляд в творчестве Ф. М. Достоевского : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.01.01 / Я. Н. Дёгтева ; ФГБОУ ВО "ВГУ". – Воронеж, 2018. – 23 с.; Лавлинский, С. П. Визуальное в литературе / С. П. Лавлинский, Н. М. Гурович // Поэтика : словарь актуальных терминов и понятий. – М. : Изд-во Кулагиной, 2008. – С. 37–39; Аксенова, А. А. Аксиологические и рецептивные аспекты визуального в литературе : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 5.9.3 – Теория литературы. – Кемерово, 2023 – 27 с.

У расійскім літаратуразнаўстве апошніх гадоў пра візуальнасць напісана шмат: Лепахин, В. В. Икона и иконичность / В. Лепахин. – СПб : Б.и, 2000; Есаулов, И. А. Мистика в русской литературе советского периода (Блок, Горький, Есенин, Пастернак) / И. А. Есаулов. – Тверь : ТвГУ, 2002. – 67 с.; Геллер, Т. Ш. О специфике художественного образа в театральном искусстве : автореф. дис. ... канд. филос. наук / Моск. гос ун-т им. М. В. Ломоносова, филос. ф-т. – М., 1972. – 22 с.; Ямпольский, М. Б. Ткач и визионер : очерки и история репрезентации или о материальном и идеальном в культуре / М. Ямпольский. – М. : Новое лит. обозрение, 2007. – 610 с.

пластыка», г. зн. стварэнне такіх апісанняў, якія выклікаюць у свядомасці чытачоў карціны, якія больш або менш адпавядаюць таму, што хацеў падкрэсліць аўтар” [9, л. 6].

Візуальнае ў трактоўцы літаратуразнаўцы С. Каўфман асэнсоўваецца як “мастацкае бачанне пісьменніка, яго пільная ўвага да падрабязнасцей, да дробязей, да стэрэаскапічнасці вобразаў, да пастаяннага пераключэння планаў гледача; як непарыўнае існаванне зроку з гукавымі і тактыльнымі адчуваннямі суб’екта, які назірае за гульнёй аптычнымі эфектамі” [10, с. 3]. Даследчык А. Арзамазаў, пагаджаючыся з тлумачэннямі С. Каўфман, слушна заўважае, што візуальнае “ў мастацкім тэксце – гэта мноства апісальных элементаў тэксту, за якімі стаяць зрокавыя ўяўленні рэцыпіента аб архітэктоніцы мастацкага свету” [11, с. 6].

Апісальныя элементы тэксту і зрокавыя ўяўленні як важныя складнікі візуалізацыі, на думку вучонага, вызначаюцца на розных узроўнях – жанравым, апавядальным, вобразным. Жанравыя інтэнцыі аўтара выкліканы выкарыстаннем прыёмаў іншых галін мастацтва – кіно (мантажнасць, буйны і сярэдні планы), жывапісу, фатаграфіі. Славесныя і жывапісныя партрэты дазваляюць ствараць шматгранныя вобразы герояў [11].

Такім чынам, у сучаснай літаратуразнаўчай навуцы прасочваецца ўстойлівая цікавасць да праблем візуальнага[1]. Штогод, пачынаючы з 2012 г., праводзіцца спецсемінар “Візуальнае ў літаратуры” пры кафедры тэарэтычнай і гістарычнай паэтыкі Інстытута філалогіі і гісторыі РДТУ.

Грунтоўны аналіз візуальнай сферы прадстаўлены ў манаграфіях А. Белага, М. Віралайнен, С. Бачарова, В. Крыванос і ў іншых даследаваннях [12].

Ключавым азначэннем візуальнага для дадзенай працы стала разуменне візуальнасці як адной з важных асаблівасцей мастацкай вобразнасці, якая абумоўлена “аўтарскай устаноўкай як на асобныя зрокавыя асацыяцыі чытача, так і на канкрэтызацыю прадметна-відавых узроўняў унутранага свету ў цэлым” [7, с. 37], прадстаўленае ў слоўніку “Паэтыка: слоўнік актуальных тэрмінаў і паняццяў” [7].

Зрокавыя асацыяцыі, бачанні аўтара і чытачоў, прадметна-відавая адметнасць вобразнасці, па нашым гіпатэтычным меркаванні, з’яўляюцца асноўнымі кампанентамі візуальнага ў творах Э. Ажэшкі.

Аспекты візуальнага ў мастацкіх тэкстах пісьменніцы падпарадкаваны раскрыццю тэмы Іншага, якая была надзвычай актуальнай у часы крызісу памежжа і не страціла сваю значнасць і ў наш час. Яна адлюстроўвае рэальныя праблемы самавызначэння чалавека і яго выжывання ў складаных абставінах. Нямецкі філосаф М. Хайдэгер у кнізе “Быццё і час”[2] адзначыў

[1] Праблемай візуальнасці займаліся такія вучоныя, як Ю. Лотман, Б. Тамашэўскі, Ю. Тынянаў, у працах якіх разглядаюцца спосабы рэпрэзентацыі візуальнага ў розных родах і жанрах літаратуры, а таксама ў іншых відах мастацтва.

[2] Хайдеггер, М. Бытие и время / М. Хайдеггер ; [пер. с нем. В. В. Бибихина]. – М. : Академ. проект, 2015. – 447 с.

агульную цікавасць да пытанняў Іншага. Вучоны заўважыў, што праблема іншай свядомасці звязана з рэальным культурна-гістарычным існаваннем чалавека. У фенаменалагічнай анталогіі Ж. П. Сартра[1] Іншы даследуецца як канстытутыўны элемент быцця чалавека. У працах М. Бахціна[2] характарыстыкамі Іншага надзяляецца дэміург і сасуб'ект.

Нягледзячы на шматлікія замежныя і айчынныя [13] даследаванні, працы, прысвечаныя вывучэнню спецыфікі Іншага ў філасофіі і літаратуры, гэты феномен на матэрыяле мастацкіх тэкстаў Э. Ажэшкі даследуецца ўпершыню.

У сітуацыі паступовага разбурэння духоўнасці, страты маральных арыенціраў і анталагічнай глебы пад нагамі жывуць героі аповесці "Нізіны". Іншыя ў мастацкай канцэпцыі пісьменніцы – гэта не прадстаўнікі іншай расы або нацыянальнасці, а розныя пункты погляду герояў, адрозныя каштоўнасці і нормы, якімі кіруюцца яны ў сваім жыцці, імкнучыся выступіць у новай ролі, выбраць адметны спосаб самарэалізацыі і самаідэнтыфікацыі.

Тэма Іншага ў мастацкіх тэкстах Э. Ажэшкі мае візуальнае выяўленне і падаецца ў кантэксце гульні святла і ценю, матываў зроку і бачання, прадбачання, прасвятлення, чужога пункту погляду. Адценнем іншасці пазначаны і прадметныя дэталі мастацкага свету пісьменніцы, касцюмы, апісанне інтэр'ера.

Іншымі ў аповесці "Нізіны" імкнуцца стаць амаль усе персанажы: парабчанка Хрысціна і яе сын Антосік, аканом Стафан Бахрэвіч і яго жонка Мадзя, адвакат Капроўскі і салдат Мікалай, селянін Ясюк.

Кожны з герояў Э. Ажэшкі мае выразную станоўчую або негатыўную матывацыю свайго пераходу на новы (іншы) узровень жыцця. Пісьменніца абгрунтоўвае, чаму салдат Мікалай стаў іншым, горшым, бо, прыйшоўшы з войска, ён застаў у сваёй старой хаце толькі чацвёра недагледжаных дзяцей, жонка пакінула іх. Пасля гэтай падзеі герой усімі праўдамі і няпраўдамі імкнецца набыць кавалак зямлі, каб пракарміць сям'ю, выбіцца ў людзі. Ён "пераступае" ўсе вядомыя нормы маралі і сумлення, служыць пасрэднікам-спакушальнікам паміж сваімі аднавяскоўцамі і адвакатам Капроўскім. Герой Э. Ажэшкі першапачаткова ведае, што Капроўскі – махляр, але актыўна вярбуе сваіх гаротных аднавяскоўцаў і сялян з суседніх вёсак быць кліентамі гэтага псеўдаадваката, спрыяе іх абкрадванню. Сваё ганебнае становішча Мікалай балюча перажывае, боль душы і горыч выліваюцца ў яго ігранні на трубе. Шчымлівая мелодыя, што гучна разліваецца ў вечаровым змроку, – сімвалічнае сведчанне душэўнага болю салдата.

Быць іншым імкнецца і Людвік Капроўскі. Хаця Э. Ажэшка і называе яго гарадскім мікробам, асуджае ўчынкі адваката, але, прадстаўляючы

[1] Сартр, Ж. П. Бытие и ничто : опыт феноменол. онтологии / Ж. П. Сартр ; [пер. с фр., предисл. В. И. Колядко]. – М. : Республика, 2004 (ППП Тип. Наука). – 639 с.

[2] Бахтин, М. М. Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин ; примеч. С. С. Аверинцева, С. Г. Бочарова. – 2-е изд. – М. : Искусство, 1986. – 444 с.

гісторыю жыцця Капроўскага, пісьменніца заўважае, што і ў яго меліся важкія прычыны, чаму ён стаў падманваць і абкрадаць іншых. Адной з іх было жаданне выжыць. У пятнаццацігадовым узросце Людвік развітваецца з марай стаць урачом, "бо ў бацькі адабралі крэсла... Гэта не было пакараннем за асабістыя грахі, а толькі вынікам грамадскага крызісу" [14, с. 73]. Капроўскі, не маючы ўстойлівага маральнага грунту пад нагамі, пачынае падманваць людзей, становіцца крывадушным, не такім, якім планаваў быць у дзяцінстве.

Пісьменніца як сапраўдны псіхолаг, сацыёлаг і грамадазнавец аналізуе ключавыя прычыны, якія прыводзяць герояў да "іншага існавання". Перыпетыі гэтага ўмоўнага пераходу ў мастацкім свеце аповесці "Нізіны" перадаюцца ў кантэксце гульні святла і ценю, выразна прадстаўленай у самым пачатку аповеду. На першай старонцы твора паказана парабчанка Хрысціна, якая ідзе, не разбіраючы дарогі, не зважаючы на каляіны. Бедная маці імкнецца выратаваць свайго сыночка Пілiпку ад непасільнай ваеннай службы. Яна прыходзіць да бацькі сваіх сыноў прасіць дапамогі. Стафан Бахрэвіч адразу нагадвае Хрысціне, каб яна не вылазіла на свет, што ліўся з вялікіх вокнаў яго хаты, а стала ў цень.

"Ценявое" існаванне жанчыны было абумоўлена ў значнай ступені і яе асабістым самапрыніжэннем. На працягу ўсёй аповесці Хрысціна паўтарае плач-споведзь, скардзіцца на долю, што замуж яе не ўзялі, вясельных песень над яе галавой ніхто не спяваў і жыла яна не так, як людзі. І цяпер у жанчыны адзіная мара быць пахаванай, пайсці з гэтага жыцця з асаблівай павагай і ўшанаваннем: калі не жыла па-людску, то "хай хоць пахаваюць годна, – так думае яна" [14, с. 73]. Хрысцінінай мары не суджана было збыцца, таму што бедная маці зрабіла памылку, паверыла падманшчыкам і махлярам, страціла свой грашовы скарб і цяпер ёй ніколі не стаць іншай. Падманутая кабета не выратавала старэйшага сыночка Пілiпку і пазбавілася павагі, добрага стаўлення да сябе з боку малодшага сына Антосіка, які таксама марыў змяніць сваё становішча, добра ажаніцца, быць самастойным гаспадаром.

Памкненні герояў быць іншымі ў творах Э. Ажэшкі адлюстраваны ў самахарактарыстыках галоўных герояў, характарыстыках адных персанажаў іншымі.

Разгорнутая самахарактарыстыка Хрысціны дапаўняецца і ўскладняецца бачаннямі герояў і апавядальніка. "Бачны" вобраз гераіні – гэта феномен свядомасці адлюстраваных суб'ектаў, таму што кожны з іх па-свойму глядзіць і ацэньвае яе. Так, Стафан Бахрэвіч лічыць Хрысціну слабахарактарнай, бязвольнай. Салдат Мікалай паважае жанчыну за яе працавітасць і мэтанакіраванасць, калі ён даведаўся, што Хрысціна змагла зарабіць трыста рублёў, то вельмі здзівіўся. Аб гэтым факце кабета спачатку расказвала неахвотна, "але на апошніх сказах выпрамілася, змучаны твар яе праяснеў і быццам памаладзеў, чорныя вочы заблішчалі <...>, са спрацаванай жабрачкі, з цёмнага, усімі зневажанага быдла перамянілася ў чалавека, што

ведае сваю вартасць і годнасць” [14, с. 56]. Відавочнае ператварэнне Хрысціны адбываецца, дзякуючы яе веры ў асабістую вартасць, але такое самаадчуванне і самаўсведамленне гераіні было рэдкім.

Няправільна ацэньвае сябе і не выходзіць з “жыццёвага ценю” аканом Стафан Бахрэвіч. Жадаючы сацыяльна ўзрасці, ён здрадзіў сапраўднаму пачуццю, пакінуў Хрысціну з двума сыночкамі, а сам ўзяў шлюб з шляхцянкаю Мадзяй.

Дабрабыт у сям’і Бахрэвічаў у большай ступені – плён працы гаспадара, але аканом лічыць, што ў асноўным – гэта заслуга руплівай Мадзі. Пісьменніца тонка заўважае, што Мадзя пастаянна ўзвышае сябе, нагадваючы мужу пра сваё шляхецкае паходжанне. Уладарнай жонцы Бахрэвіча здаецца, што яна – прадстаўніца вышэйшага саслоўя, але яе павышаная сварлівасць і крыклівасць, любоў да бойкі, прадметна-рэчавы свет, якім сябе яна акружыла, сведчаць аб несфарміраваным эстэтычным гусце, аб дысгармоніі ў яе жыцці. Гэта становіцца відавочным, калі чытач скіроўвае пагляд у хату Мадзі Бахрэвіч. Э. Ажэшка па-майстэрску выкарыстоўвае два аптычна матываваныя вобразы – экстраспекцыі, або выглядванне вонкі, і інтраспекцыі – заглядванне ў сярэдзіну. Чытач заглядвае ў хату Мадзі праз вялікія вокны. За тымі вокнамі быў досыць вялікі квадратны пакой, у адным з кутоў якога была печ з зялёнай цэглы, а ў “другім куце стаяла вельмі старэнькае і занядбанае фартэпіяна, з аблезлай палітурай і пажоўклымі ад старасці клавішамі” [14, с. 28].

У хаце Бахрэвічаў дамінуе супрацьпастаўленне штучнасці і натуральнасці. Пісьменніца заўважае, што “на вокнах не было ні зялёных раслін, ні кветак, замест гэтага на сетачных, ручнога вырабу фіранках віселі розныя дзіўныя кошычкі, вазонікі, букецікі, таксама ручной работы, – з нітак, пацерак, паперы, паркалю і г. д.” [14, с. 28]. Усе прадметы пададзены ў несумяшчальным адзінстве. У апазіцыйнай повязі святых абразоў і свецкіх партрэтаў, старасвецкай мэблі і квяцістага паркалю, зялёнай печы і занядбанага фартэпіяна падкрэслена жаданне гаспадароў паказаць сябе ў іншым свеце. На самой справе яны не валодалі ні магчымасцямі, ні дакладнымі грунтоўнымі ведамі, ні здольнасцямі, якія б адпавядалі высокаму статусу альбо дазволілі б ім наблізіцца да яго.

Больш гарманічна ў гэтым плане выглядае жытло Ясюка і Хрысціны, дзе ў адпаведнай паслядоўнасці і адзінстве знаходзяцца між сабой рэчы і прадметы. Там былі лаўкі, сталы, двое кроснаў, балеі, вёдры, чыгуны, прылады для цёркі і часання лёну, матавілы, бочкі з квашанымі буракамі і капустай, мяшкі з бульбай, збожжам, мукой і г.д. Толькі ў гэтую прадметную аднароднасць ніяк не ўпісвалася фігура чалавека, што выглядала адзінока і адчужана на фоне прадметнай упарадкаванасці.

Дэталі – характарыстыкі касцюмаў, прадметаў тыпу “даматканыя кашулі”, альбо сплеценая з лазы калыска – падкрэсліваюць блізкасць чалавека да прыроды. Прыроднасць, натуральнасць чалавека ўхваляецца пісьменніцай, якая з лагоднай сімпатыяй малюе маладыя “шырокаскулыя тварыкі, кірпатыя

носікі, малыя вочкі” [14, с. 30] дочак Бахрэвіча і з іранічнай усмешкай згадвае пра іх модныя ўборы: “сукенкі з самай таннай тканіны былі надзьмутыя і выпуклыя ажно залішне”[14, с. 30].

Пісьменніца вачыма адваката Капроўскага любуецца прыгажосцю басаногай здаровай сялянкі, якая ў дамаканай спадніцы і кашулі разам з Мадзяй прыбірала са стала пасля вячэры. І нават басаногасць дзяўчыны ўспрымаецца як знак яе добрага здароўя. Прывабным выглядае і салдат Мікалай, калі падчас сенакосу або праполкі ільну і пшаніцы ён працуе “без шапкі, адно ў портках і кашулі, босы” [14, с. 82]. Разутасць Мікалая і маладой сялянкі ў час руплівай працы на зямлі сведчыць пра іх натуральную моц, пра блізкасць да прыроднай стыхіі.

Але недахоп асобных дэталяў у касцюмах герояў Э. Ажэшкі асвятляе душэўную дысгармонію. Узгадаем, як пасля гарачай размовы з жонкай Стафан Бахрэвіч выскаквае “без шапкі <…>, цяжка ўздыхнуўшы, сышоў з ганка і ступіў колькі крокаў, як быццам збіраючыся ісці куды вочы глядзяць” [14, с. 25], бездапаможнымі сталі і раней моцныя босыя ногі Хрысціны, “увязлыя ў гразі” [14, с. 25].

Не толькі недастатковасць, незавершанасць касцюма, але і залішняя колькасць дэталяў у ім выглядае шматзначна, як у выпадку з вопраткай адваката Капроўскага: “Калі б у гасцёўні Бахрэвічаў было б цёмна, то постаць госця асвятліла б яе. Гэта быў чалавек не такі ўжо і маладзенькі <…> але надзвычай элегантны, смелы, можна сказаць вытанчаны, хударлявы, невысокі, з ног да галавы акрыты тонкім і добра скроеным сукном <…>. Блішчаў ён шырокай, цвёрдай манішкай кашулі, залатым ланцужком ад гадзінніка, залатой аправай блакітных шкельцаў, умешчаных на не зусім ужо каб грэцкім носе…” [14, с. 30].

Багаты касцюм Капроўскага можна разглядаць у двух праекцыях. Першы погляд падае на суцэльнасць касцюма. Магчыма, такім суцэльным сукном і прыкрывалася бездухоўнасць адваката. Сапраўдны духоўны свет гэтага героя нельга разгледзець, таму што гэтаму перашкаджае адбітак, які зыходзіць ад бліскучай паверхні залатога гадзінніка і бліскучых шкельцаў акуляраў, што адштурхоўваюць ад сябе прамы погляд і перашкаджаюць успрыманню чалавечай сутнасці адваката Капроўскага.

Такім чынам, аспекты візуальнага ў аповесці “Нізіны” Э. Ажэшкі прадстаўленыя як элементы зроку, бачання, бачнасці, зрокавыя асацыяцыі; як самахарактырыстыка і пункты погляду герояў; як канкрэтна-прадметныя ўзроўні аўтарскага апісання. Усе тры праявы падпарадкаваны асвятленню перыпетый асабістага і грамадскага жыцця герояў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Творчасць Элізы Ажэшкі і беларуская культура : зб. навук. прац / пад рэд. С. П. Мусіенкі. – Гродна : Гр. ДУ, 2002. – 330 с.

2. Творчество Элизы Ожешко в эстетическом пространстве современности : сб. науч. ст. / Учреждение образования “Гродненский государственный университет имени Янки Купалы" ; под ред. С. Ф. Мусиенко ; ред. кол.: С. Ф. Мусиенко, Е. П. Нелепко, Е. И. Билютенко. – Гродно : ГрГУ, 2011. – С. 16–31.
3. *Лявонава, Е.* Чуйнае сэрца. Штрыхі да творчага партрэта Элізы Ажэшкі” / Е. Лявонава // Наша вера. – 2016. – №4. – С.40–44.
4. *Билютенко, Е. И.* Тема наднеманской деревни в романе Элизы Ожешко “Дзюрдзи” / Е. И. Билютенко // Творчасць Элізы Ажэшкі і беларуская культура : зб. навук. прац / Установа адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”, кафедра польскай філалогіі ; пад рэд. С. П. Мусіенкі. – Гродна : ГрДУ, 2002. – С. 81–91.
5. *Гапава, В.* Эліза Ажэшка. Жыццё і творчасць / В. Гапава ; пер. з рус. мовы У. Дамашэвіча – Мінск : Беларусь, 1969. – 232 с.
6. *Гарадніцкі, Я.* Праблема візуальнага ў літаратуры / Я. Гарадніцкі // Наука и инновации : науч.-практ. журнал / учредитель Национальная академия наук Беларуси. – 2011. – № 9. – С. 55–57.
7. Поэтика: словарь актуальных терминов и понятий / [гл. науч. ред. Н. Д. Тамарченко]. – М. : Издательство Кулагиной; Intrada, 2008. – 358 с.
8. *Васиярова, О. А.* Визуализация в прозе Д. И. Рубиной XXI века : “Холодная весна в Провансе”, “Окна” : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.01.01 / Васиярова Ольга Александровна ; [ФГБОУ ВО Моск. пед. гос. ун-т]. – М., 2019 – 22 с.
9. *Мухачёв, Д. А.* Визуальная поэтика Петербурга в творчестве В. В. Набокова : русский период : дис. ... канд. филол. наук : 10.01.01 / Мухачёв Дмитрий Андреевич ; [ГАОУ ВО ГМ “Моск. гор. пед. ун-т”]. – М., 2021. – 191 л.
10. *Кауфман, С. Н.* Визуальность в поэтике Н. В. Гоголя : повествовательный аспект : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.01.01 / Кауфман Светлана Николаевна; [Новосиб. гос. пед. ун-т]. – Новосибирск, 2013. – 15 с.
11. *Арзамазов, А. А.* Феномен визуального в удмуртской устно-поэтической традиции и современной поэзии : на анализе творчества П .М. Захарова : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.01.09 / Арзамазов Алексей Андреевич ; [Ульян. гос. пед. ун-т им. И. Н. Ульянова]. – Ульяновск, 2010. – 18 с.
12. Визуальное во всем : сб. ст. / сост. и ред. В. Я. Малкина, С. П. Лавлинский. – М. : Эдитус, 2022. – Вып. 3. – 184 с.
13. *Бахановіч, Н. Л.* Абліччы іншага ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX стагоддзя / Н. Л. Бахановіч. – Мінск : Беларус. навука, 2022. – 303 с.
14. *Ажэшка, Э.* Выбраныя творы / Э. Ажэшка ; уклад., прадм. і камент. В. Гапавай. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2000. – 512 с.


*Поступила в редакцию 13.03.2025*